Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за ліпень 2015 г.**

**<u>Мерапрыемствы да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і 70-годдзя вызвалення г. Кобрына і Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў</u>**

**2 ліпеня**

Наведванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны на даму "І сэрца помніць кожны бой". Удзельнікі фальклорнага гурта наведалі ветэранаў: Гарбарука Рыгора Якаўлевіча і Дзземедзюка Васіля Сямёнавіча. Гучалі віншаванні з Днём Незалежнасці, вершы і пажаданні, у выкананні удзельніц гурта - беларускія народныя песні.

*Балоцкая СБ, 14 чал.*

**5 ліпеня**

Літаратурна-музычная кампазіцыя "Жыві і квітней наша Белая Русь". На мерапрыемстве гучала песня "Белая Русь" у выкананні Юзепчука А., праведзена віктарына па старонках гісторыі беларускай дзяржавы.

*Бельская СБ, 15 чал.*

**5 ліпеня**

Арганізавана выступленне ЛПГ "Украденное детство: к освобождению Беларуси". Прысутным прапанаваны: віктарына "Знаешь ли ты юных героев Великой Отечественной войны?", конкурс чытальнікаў патрыятычных вершаў, электронная прэзентацыя "Спасибо солдатам Победы за то, что не знаем войны".

*Павіццеўская СБ, 20 чал.*

**<u>Іншыя мерапрыемствы</u>**

**1 ліпеня**

Сумесна з Гарадзецкім сельскім клубам прайшло свята "Зажигай по-молодёжному". Падчас свята супрацоўнікі бібліятэкі ўшаноўвалі лепшых чытачоў, упісаных у кнігу Пашаны Гарадзецкай бібліятэкі: Тарасюка Ю.А, Антанюк В.А, Сінкевіча Я, Тоўсціка А, Баран М і інш . Усім ўручаны памятныя падарункі. Для гасцей свята арганізатары падрыхтавалі розныя конкурсы, гульні, бяспройгрышныя латарэі і святочны канцэрт.

*Гарадзецкая СБ, 70 чал.*

**4 ліпеня**

Адбыўся Дзень гісторыі "Гэта павінен ведаць кожны". Да ўвагі прысутных прапанавана гульнёва-конкурсная праграма "Гэта павінен ведаць кожны", віктарына з пытаннямі на грамадзянскую тэму і гульні на адкрытай пляцоўцы. Самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі прызы.

*Шамятоўская СБ, 22 чал.*

**5 ліпеня**

Літаратурна-спартыўнае свята "Молодёжь выбирает здоровье". Для гасцей свята падрыхтавана літаратурна-музычная праграма "Поклонимся великим тем годам" пры ўдзеле мастацкіх калектываў Буховіцкага СДК, кніжная выстава "Дарогамі вайны" і спартыўнае спаборніцтва пры ўдзеле Мінянскай СШ.

*Мінянская СБ, 30 чал.*

**10 ліпеня**

Аддзел бібліятэчнага маркетынгу арганізаваў трэнінг для сельскіх бібліятэкараў "Стварэнне прэзентацый да конкурсу "Малады чытач 2015"- праца над памылкамі" . Шмат карысных парад дала заг. Дзівінскім с/філіялам Саўчук Е.Н . Супрацоўнікі азнаёміліся з

элементамі , якія дапаўняюць прэзентацыю: ілюстрацыйны рад, шрыфтавы рад, анімацыйны рад і г.д.

*ЦБ, 65 чал.*

**18 ліпеня**

Супрацоўнікі цэнтральнай раённай і дзіцячай бібліятэк прынялі актыўны ўдзел у святкаванні Дня горада. Для гасцей і жыхароў горада разгарнулі парад кніжных выстаў “Родны сэрцу горад мой”. Дзень краязнаўства адкрыла літаратурна-музычная кампазіцыя “Мой город - мая любоў”. Паэты народнага аматарскага клуба "Белы бусел" выступілі ў паэтычным марафоне “Красою ты квітней штодня, мой родны Кобрын - мая зямля”. Дзяцей парадавала пляцоўка чытаючага дзяцінства "Чытайце, гуляйце, тварыце, адпачывайце”. Жадаючыя маглі прыняць удзел у фотасесіі “Я і кніга ў аб'ектыве”. У канцы свята адбыўся флэшмоб “Дарослыя і дзеці! Чакаем у бібліятэцы”.

*ЦБ і ДБ*

**18 ліпеня**

Падчас святкавання 728 - годдзя горада Кобрына на адной з найпрыгажэйшых вуліц - вуліцы Суворава адбылося ўрачыстае адкрыццё альтанкі буккросінгу . Ініцыятарам такога карыснага пачынання стала кіраўніцтва Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта ў асобе А.І. Зазулі і В.В. Трубчыка. Жыхары горада, якія сабраліся на ўрачыстае адкрыццё альтанкі буккросінгу, актыўна падтрымалі новы рух і з задавальненнем абмяняліся кнігамі.

*ЦБ*

**23 ліпеня**

Інфармацыйны агляд “Летние каникулы с новой книгой”. Дзяцей малодшага школьнага ўзросту пазнаёмілі з кнігамі Алёны Масла “Вандроўка з божымі кароўкамі”, “Першая Прыгажуня”. Для дзецей сярэдняга школьнага ўзросту прапанаваны кнігі Аляксандра Етоева “Правило левой ноги, “Нечёртова  дюжина” і інш.

Выканаўца
Муца Т. І.
ОБМ
2-36-81